# § 9. Сямейныя адносіны

## Сям'я — галоўнае ў жыцці кожнага чалавека?

### Узрост уступлення ў шлюб




У сярэднім беларуская сям'я складаецца з трох чалавек.

### Функцыі сям'і



### Віды сям'і

- Нуклеарныя / Пашыраныя
- Поўныя / Няпоўныя
- Бяздзетныя / Аднадзетныя / Двухдзетныя / Шматдзетныя

### Этапы развіцця сям'і



**Шлюб і сям'я.** У жыцці кожнага чалавека вельмі важнае значэнне мае сям'я. Менавіта ў сям'і адбываецца станаўленне і развіццё асобы, складваюцца найбольш блізкія і ўстойлівыя адносіны паміж людзьмі. Існуе мноства азначэнняў сям'і. Аднак большасць навукоўцаў пад сямейнымі адносінамі разумеюць *шлюб*, *бацькоўства* і *сваяцтва*. У паўсядзённым жыцці, калі мы гаворым пра сям'ю, мы можам мець на ўвазе сваіх бацькоў, бабуль і дзядуляў, а таксама далёкіх сваякоў.

Сталеючы, людзі бяруць шлюб, нараджаюць дзяцей — і межы сям'і пашыраюцца. У яе ўваходзяць муж/жонка, іх сваякі, а таксама ўласныя дзеці. Пры гэтым адных роднасных сувязяў бывае



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

недастаткова для таго, каб мы гаварылі пра іншага чалавека як пра члена сваёй сям'і. Сямейныя адносіны ў якасці неабходнай умовы прадугледжваюць блізкія зносіны паміж людзьмі. Такім чынам, **сям'я** — гэта аб'яднанне людзей, якія звязаны паміж сабой повязямі шлюбу, бацькоўства або сваяцтва і знаходзяцца ў непасрэдных пастаянных блізкіх зносінах.

Навошта людзі імкнуцца даведацца пра гісторыю свайго роду? Імёны прадстаўнікоў колькіх пакаленняў сваіх продкаў вы ведаеце? ■




Як знайсці сваіх продкаў і скласці радавод? Выкарыстайце рэкамендацыі на сайце Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі.

Радаслоўнае (генеалагічнае) дрэва — гэта схематычнае прадстаўленне роднасных сувязяў у выглядзе ўмоўна-сімвалічнага «дрэва» («карані» — родапачынальнік, «ствол» — прадстаўнікі асноўнай (па старшынстве) лініі роду, «галіны» — розныя роднасныя лініі, нашчадкі — «лісце»). ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Сям'я як малая група ўяўляе сабой нефармальнае аб'яднанне людзей (нефармальную групу). Міжасобасныя адносіны ў кожнай сям'і фарміруюцца індывідуальна. Разам з тым нельга сказаць, што ўзаемаадносіны ўнутры сям'і нічым не рэгулююцца звонку. У Беларусі, як і ў многіх іншых краінах, дзейнічае заканадаўства, у якім вызначаюцца правы і абавязкі членаў сям'і ў дачыненні адно да аднаго.

Вядома, мала хто думае пра заканадаўства, калі сустракае каханага чалавека і плануе сур'ёзныя адносіны ў будучыні. У сучасным грамадстве вырашальную ролю пры ўзяцці шлюбу маюць асабістыя перавагі, а галоўным матывам уступлення ў шлюб з'яўляецца каханне. З пункту гледжання закону шлюбныя адносіны прызнаюцца дзяржавай толькі ў выпадку іх рэгістрацыі. Пад **шлюбам** разумеецца зарэгістраваны ў спецыяльных органах добраахвотны саюз мужчыны і жанчыны, які накіраваны на стварэнне сям'і і спараджае для бакоў узаемныя правы і абавязкі.

Прааналізуйце статыстычныя звесткі з уводнай інфаграфікі і вызначце, як у Беларусі за апошнія гады змяніўся сярэдні ўзрост мужчын і жанчын, якія бяруць першы шлюб. ■

З дапамогай дадатковых крыніц інфармацыі знайдзіце звесткі пра сярэдні ўзрост уступлення ў шлюб у іншых краінах. ■

За час свайго існавання сям'я перажывае пэўную паслядоўнасць змены стадый, якая складае яе жыццёвы цыкл. У якасці асноўных стадый, што праходзіць сям'я за час свайго існавання, можна назваць наступныя: стадыя заляцання (перадшлюбныя адносіны паміж мужчынам і жанчынай); уступленне ў шлюб; стадыя маладой сям'і; фарміраванне поўнай сям'і (з'яўленне дзяцей); стадыя сталай сям'і (сталенне і сацыялізацыя дзяцей); стадыя «апусцелага гнязда» (аддзяленне дарослых дзяцей ад бацькоў); стадыя распаду сям'і (старэнне і смерць мужа і жонкі). Пры гэтым



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

жыццёвы цыкл кожнай канкрэтнай сям'і не абавязкова ўключае ўсе названыя стадыі.

Чаму некаторыя сем'і распадаюцца? Як звязаны матывы ўступлення ў шлюб і прычыны разводаў? ■




У пяцёрку прычын разводаў сёння ўваходзяць шлюбная здрада і рэўнасць, несупадзенне характараў і розныя погляды на жыццё, няўменне ісці на кампрамісы і саступаць адно аднаму. Як, на вашу думку, гэтыя прычыны звязаны з матывацыяй і самаацэнкай асоб мужа і жонкі? ■

На працягу свайго развіцця кожная сям'я перажывае цэлы шэраг крызісаў. Паспяховасць іх пераадолення залежыць ад еднасці сям'і, адэкватных чаканняў членаў сям'і адно ад аднаго, гібкасці ўзаемаадносін паміж імі.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Віды і функцыі сям'і.** Для большага разумення ўсёй складанасці і шматграннасці такой з'явы, як сям'я, разгледзім яе асноўныя віды. Па структуры роднасных сувязяў вылучаюць *нуклеарныя* (простыя) сем'і, якія складаюць толькі муж і жонка або муж і жонка з непаўналетнімі дзецьмі, і *пашыраныя* сем'і, у склад якіх уваходзяць іншыя сваякі (напрыклад, бабулі і дзядулі), што жывуць разам. Па наяўнасці бацькоў існуюць *поўныя* (з абаімі бацькамі) і *няпоўныя* (з адным з бацькоў: ці матчыны, ці бацькавы) сем'і. Па наяўнасці і колькасці дзяцей можна вылучыць *бяздзетныя*, *аднадзетныя*, *двухдзетныя*, а таксама *шматдзетныя* (тры дзіцяці і больш) сем'і.

У сучасным грамадстве сям'я выконвае мноства розных функцый. Назавём асноўныя з іх.

| Функцыі сям'і | |
|---|---|
| **Рэпрадуктыўная** | Сям'я падтрымлівае біялагічную бесперапыннасць грамадства шляхам узнаўлення новых пакаленняў людзей |
| **Гаспадарча-бытавая** | Сям'я забяспечвае матэрыяльныя ўмовы жыццядзейнасці яе членаў, вядзенне хатняй гаспадаркі, прыгатаванне ежы, набыццё новых рэчаў, адзення, бытавой тэхнікі. Унутры сям'і адбываецца размеркаванне даброт, атрыманне ў спадчыну маёмасці |
| **Выхаваўчая** | Сям'я спрыяе сацыялізацыі членаў грамадства, перадае нормы і манеры паводзінаў, выхоўвае маладое пакаленне, ажыццяўляе сацыяльны кантроль |
| **Эмацыйная** | Сям'я забяспечвае ўсім членам задавальненне патрэб у любві, цяпле і паразуменні, павазе і прызнанні, эмацыйнай падтрымцы, дае адчуванне бяспекі («прытулак у імклівым зменлівым свеце»), эмацыйнай раўнавагі |
| **Рэкрэацыйная** | У сям'і задавальняюцца патрэбы ў камфорце і ўтульнасці, рацыянальнай арганізацыі вольнага часу і адпачынку, стварэнні ўмоў для ўмацавання здароўя |



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

На працягу тыдня адзначайце ў табліцы працу, якую выконваюць дома члены вашай сям'і, у тым ліку вы самі. Адлюструйце ў выглядзе схемы суадносіны паміж хатняй працай і членамі сям'і. ■

**Для сем'яў характэрны розныя формы і спосабы арганізацыі сумеснага жыцця. У сувязі з гэтым вылучаюць:**

- **сем'і з дамінаваннем у прыняцці рашэнняў аднаго боку — мужчыны альбо жанчыны (патрыярхальная ці матрыярхальная сям'я);**
- **сем'і, дзе муж і жонка маюць роўныя правы і абавязкі (раўнапраўная сям'я).**

**У наш час усё больш распаўсюджанай становіцца раўнапраўная сям'я. Узаемаадносіны ў розных тыпах сем'яў залежаць ад ступені прыхільнасці, адданасці, зносін і паразумення паміж членамі сям'і.**

**Як бачым, сям'я змяняецца разам з грамадствам, у якім мы жывём. Але некаторыя каштоўнасці застаюцца нязменнымі.**

**Сям'я 150 гадоў таму і сёння: у чым падабенства і адрозненне?**

Ахарактарызуйце адлюстраваную на карціне групу.

- Па чым можна меркаваць, што гэта сям'я?
- Якія функцыі сям'і могуць быць праілюстраваны з дапамогай карціны?
- Ці можна лічыць гэтую сям'ю шчаслівай? Сфармулюйце аргументы «за» і «супраць» такога сцвярджэння. ■



*Севярын Кроер.*
*Сям'я Гіршпрунга. 1881 г.*

Як вы думаеце, чаму ў інтэрнэце гэтая карціна атрымала гумарыстычны каментарый, які зрабіў яе папулярнай сёння: «Як члены сям'і ігнаравалі адно аднаго да вынаходства смартфонаў»? ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Сям'я як каштоўнасць.** Важнасць сям'і ў жыцці чалавека і грамадства выяўляецца ў разнастайнасці і значнасці функцый, якія яна выконвае. Як ужо адзначалася, у грамадстве сям'я выконвае асноўную ролю ў біялагічным аднаўленні і сацыялізацыі новых пакаленняў. Для кожнага канкрэтнага чалавека каштоўнасць сям'і заключаецца ва ўсталяванні найбольш блізкіх міжасобасных адносін, якія з'яўляюцца базавай патрэбай.

У СМІ, публіцыстычнай і навуковай літаратуры можна сустрэць паняцце «сямейныя каштоўнасці». Што ўключаюць у сябе сямейныя каштоўнасці ў сучасным грамадстве? На гэтую тэму праводзіцца мноства даследаванняў. У большасці выпадкаў, кажучы пра сямейныя каштоўнасці, людзі маюць на ўвазе наступнае.

*1. Прыярытэт сямейных адносін перад іншымі відамі міжасобасных і групавых адносін.* У паўсядзённым жыцці перад чалавекам часта паўстае выбар, правесці час з сябрамі або дома ў коле сям'і, затрымацца на працы ці пагуляць са сваім дзіцем. У адпаведнасці з прыярытэтам сям'і ў такіх сітуацыях чалавек будзе не толькі кіравацца сваімі інтарэсамі, але і ўлічваць інтарэсы родных яму людзей.

*2. Любоў і павага паміж членамі сям'і.* Бясспрэчным з'яўляецца той факт, што выкананне ўсіх функцый сям'і, асабліва эмацыйнай, немагчыма без цёплых, даверных адносін паміж яе членамі.

*3. Вернасць мужа і жонкі ў дачыненні адно да аднаго.* Нягледзячы на ўсю разнастайнасць формаў шлюбных адносін паміж людзьмі, большасць маладых людзей па-ранейшаму лічаць вернасць неабходнай умовай сур'ёзных, доўгіх адносін.

*4. Нараджэнне дзяцей як неабходная ўмова шчаслівага шлюбу.* Беручы шлюб, большасць людзей арыентуюцца на нараджэнне дзіцяці. Дзеці напаўняюць новым зместам і сэнсам шлюбныя адносіны. Адказнасць за жыццё новага чалавека робіць шлюб больш моцным, паколькі выхаванне дзіцяці становіцца найважнейшай сумеснай дзейнасцю мужа і жонкі, іх агульным інтарэсам.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Вызначце, пра якія функцыі сям’і ідзе гаворка ў наступных сітуацыях, і прапануйце ўласныя прыклады:
   - паездка ў выхадны дзень бацькоў з дзецьмі на веласіпедах у гандлёвы цэнтр па пакупкі;
   - сумесная падрыхтоўка сваякамі сюрпрызу для бабулі на яе юбілей;
   - візіт у прытулак для бяздомных жывёл для таго, каб узяць адтуль гадаванца;
   - напамін мужу або жонцы пра дату планавага медыцынскага абследавання і інш.
2. З дапамогай уступнай інфаграфікі ахарактарызуйце сям’ю як малую сацыяльную групу. Якая інфармацыя пра сям’ю як пра групу, на вашу думку, адсутнічае ў інфаграфіцы? Абгрунтуйце.
3. Ці адпавядае рэйтынг жыццёвых каштоўнасцей маладых беларусаў з апытання 2018 г. вашым сённяшнім жыццёвым прыярытэтам? Растлумачце сваю пазіцыю. ■




Выканайце міні-праект «Мая сям’я ў часе і прасторы». Складзіце генеалагічнае дрэва вашай сям’і на аснове гутарак з блізкімі і далёкімі сваякамі. Прэзентуйце сваё генеалагічнае дрэва ў выглядзе постара, пры жаданні можаце ўключыць у яго фота, ілюстрацыі. ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне